# «КАЛІ ЦЯБЕ СПАТКАЕ КАЗКА...»

***Знамянальнай падзеяй адыходзячага года для кандыдата філалагічных навук, дацэнта кафедры літаратуры Ганны Віктараўны Навасельцавай, несумненна, стаў выхад зборніка сучасных казачных гісторый «Калі цябе спаткае казка...». Прэзентацыя кнігі адбылася напрыканцы лістапада ў Віцебскай абласной бібліятэцы імя У. І. Леніна. З гэтай нагоды мы сустрэліся з пісьменніцай і пагутарылі пра яе творчасць.***




***— Ганна Віктараўна, калі да Вас прыйшла задума напісаць гэтую кнігу?***

— Зборнік сучасных казачных гісторый склаўся сам сабою, я проста пісала новыя творы. Было жаданне па-мастацку ўвасобіць адметныя казачныя матывы і вобразы, данесці гэта да чытачоў, сярод якіх і вы, мае студэнты. Было жаданне цікава і змястоўна расказаць не толькі пра міф, але і казку. Мабыць, тады і прыйшла задума, якая і рэалізавана ў прадстаўленай кнізе. У сучасным прыгожым пісьменстве казкатворчасць — гэта запатрабаваная эстэтычная стратэгія, скіраваная на чытачоў розных узростаў.

***— Цікава, адкуль такая незвычайная назва кнігі?***

— Я б сказала, што назва самая звычайная... Сучасная літаратура актыўна змагаецца за чытача, імкнецца прыцягнуць яго ўвагу, ідзе насустрач яго запатрабаванням. Калі выказвацца метафарычна, ідучы насустрач — імкнецца спаткаць... І яшчэ варта памятаць, што казка — вельмі гнуткі жанр, лёгка напаўняецца рэаліямі з акаляючай рэчаіснасці. Думаецца, тое, што побач з намі, можа напаткаць кожнага з нас, а казачны свет дапамагае шукаць альтэрнатывы...

***— Што Вас натхняе на літаратурную творчасць?***

— Як і кожнага аўтара, які працуе ў літаратуры фэнтэзі, мяне натхняюць міфалогія і фальклор. Як нацыянальная спадчына беларусаў, так і сусветная. У маёй кнізе галоўнымі героямі выступаюць вядомыя чарадзейныя персанажы, міфалагічныя істоты, якія праходзяць дзівосныя выпрабаванні. У свеце цудаў трэба задумацца, чаму ліска-чарадзейка шкодзіць дзеду з бабай, што ставіць вышэй за дабрабыт незвычайны каток, на якія ўчынкі здатная сучасная Палялушка. Можна скептычна адносіцца да таго, што свет трымаецца на трох кітах, але цяжка аспрэчыць тое, што мастацтва слова — гэта трыадзінства міфалогіі, вуснай народнай творчасці і прыгожага пісьменства.

***— Ганна Віктараўна, ці ёсць у Вас ужо задума для новай кнігі?***

— Ёсць задума напісаць бестселер па матывах грэчаскай, кельцкай, скандынаўскай міфалогіі, каб зацікавіць студэнтаў міфалогіяй рамана-германскіх народаў. Расказваць пра гэта пакуль што не буду, бо пра задумы не гавораць...

***— Што пажадаеце тым, хто толькі пачынае пісаць?***

— Маё шчырае перакананне ў тым, што любая творчасць пачынаецца з простага, але вялікага захаплення. Я жадаю вам захапляцца. Я жадаю вам натхняцца. І тады ўсё ў вас атрымаецца!

**Алеся МЯДЗІЛЬ,**
**студэнтка 3-га курса ФлФ.**

**На здымках:** *(уверсе)* Ганна Навасельцава; *(унізе)* Ганна Віктараўна з калегамі.

**Фота з архіва абласной бібліятэкі.**

